**В.У.Мазанік,** *дацэнт*

# САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫЯ НАВУКІ Ў СІСТЭМЕ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

На сучасным этапе сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у творчых навучальных установах не заўсёды адпавядае рэаліям будучай прафесійнай дзейнасці, перш за ўсё патрабаванням развіцця пэўных відаў мастацтва. Прынцыпова новыя ўмовы існавання мастацкай культуры (камерцыялізацыя, урбанізацыя, глабалізацыя, тэхнічны прагрэс), змяненне каштоўнасных арыенціраў грамадства патрабуюць якасна новага падыходу да адукацыі будучых спецыялістаў у галіне мастацкай культуры.

У апошні час значнае месца сярод агульнагуманітарных дысцыплін займае сацыялогія — навука пра грамадства, заканамернасці і тэндэнцыі яго развіцця. У наш час беларуская сацыялогія мае шэраг кірункаў, якія ўзначальваюць вядомыя вучоныя: гісторыя і тэорыя сацыялогіі (Я.Бабосаў, Г.Давідзюк, І.Антановіч, А.Елсукоў), сацыялогія асобы (Я.Бабосаў), эканамічная сацыялогія і сацыялогія працы (Г.Сакалова), сацыялогія сям'і (М.Юркевіч, С.Лапцёнак, С.Бурава), сацыялогія навукі (Г.Несвятайлаў), сацыялогія культуры (Э.Дарашэвіч, В.Русецкая, С.Лапіна), сацыялогія адукацыі (А.Ляўко, В.Кліменка), палітычная сацыялогія (І.Катляроў, В.Бушчык) і інш. [3].

Сацыялогія музыкі – навука адносна новая, звязаная з пытаннямі сацыялагічнай тэорыі, распрацоўкай якой займаецца кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі І.Галавач. Відавочна, што курс агульнай сацыялогіі, мэта якога «фарміраванне ў студэнтаў навуковых уяўленняў аб грамадстве і сацыяльным свеце чалавека, аб сацыяльных заканамернасцях станаўлення, функцыянавання і развіцця сацыякультурнай рэальнасці, аб магчымасцях пазнання гэтых заканамернасцей і выкарыстання атрыманых ведаў ў канкрэтнай прафесійнай дзейнасці» [4], не можа ў поўнай меры адлюстраваць заканамернасці

бытавання, фарміравання, развіцця музычнага мастацтва і яго ўзаемадзеяння з грамадствам.

І.Галавач, бадай, адзіны навуковец у сферы сацыялогіі музычнага мастацтва, аўтар шэрага публікацый па пытаннях азначанага кірунку, з'яўляецца таксама распрацоўшчыкам праграмы курса «Музычная сацыялогія» [2]. У адным з артыкулаў яна вылучае некалькі фактараў, якія абумоўліваюць неабходнасць вывучэння сацыялагічных праблем музычнага мастацтва [1]. Першы – гэта «аднаўленне зместу музычнай адукацыі», звязанага не толькі з ведамі аб «розных аспектах узаемасувязі чалавека і мастацтва ў сацыякультурнай прасторы», але і з магчымымі нечаканымі праявамі ў будучай прафесійнай дзейнасці. Другі фактар абумоўлены неабходнасцю «чутка рэагаваць на сучасную сацыякультурную сітуацыю», улічваючы складанасці паміж мастацтвам і «ўмовамі яго сацыяльнага бытавання». Трэці фактар звязаны з «вызначэннем статуса сацыялогіі мастацтва (музыкі) у сістэме навук». Тут гаворка ідзе аб міжпрадметным узаемадзеянні такіх навук, як псіхалогія, педагогіка, мастацтвазнаўства, музыказнаўства і іншых, аб неабходнасці ўкаранення сацыялагічнага падыходу ў музыказнаўчую навуку, што паспрыяе, на думку аўтара, выяўленню і раскрыццю спецыфічных функцый мастацтва. «Непахісная» сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў, існуючая ў галіне музычнага мастацтва, вызначае чацвёрты фактар, які абумоўлівае неабходнасць сацыялагічнай адукацыі студэнтаў. Даследчык бачыць неабходнасць пераарыентацыі курса сацыялогіі, які быў бы накіраваны непасрэдна на праблемы менавіта музычнага мастацтва. З гэтай мэтай і была створана праграма курса «Музычная сацыялогія».

Асноўная ідэя курса сацыялогіі музыкі, прадметам якой з'яўляецца ўзаемадзеянне музычнага мастацтва і грамадства, заключаецца ў пастаноўцы і рашэнні актуальных для музычнага мастацтва праблем тэарэтычнага характару, такіх як музычная камунікацыя (кампазітар – выканаўца – слухач), музычная асвета (успрыманне музыкі ў сучасным свеце), музычная прафесійная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыя і інш. У праграму курса ўключаны пытанні аналізу «сацыяльных і сацыялагічных аспектаў гісторыі музыкі Беларусі», што аб'ядноўвае сацыялогію як навуку з мастацтвазнаўствам і музыказнаўствам. У дадзеным курсе прадугледжваецца распрацоўка сістэмы сацыялагічнага даследавання, накіраванай на атрыманне ведаў аб пэўных сацыяльных з'явах і працэсах, тэндэнцыях і супярэчнасцях іх развіцця ў музычным мастацтве, а таксама вывучэнне метадаў збору і апрацоўкі сацыялагічнай інфармацыі.

Такім чынам, зразумела, што музычная сацыялогія як спецыфічная галіна сацыялагічнай тэорыі павінна стаць не апошнім звяном у сістэме музычнай адукацыі. Уменні выяўляць, аналізаваць сацыялагічныя аспекты з'яў сучаснага музычнага мастацтва, разглядаць тэндэнцыі яго развіцця ў сувязі з сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі і духоўнымі зменамі ў грамадстве з'яўляюцца асноўнымі ў падрыхтоўцы студэнтаў вышэйшых музычных вучэбных установ, што, безумоўна, станоўча павінна адбіцца на далейшай прафесійнай дзейнасці.

---


1. *Головач И.М.* Социология в музыкальном вузе: проблемы и перспективы // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2002. – №2. – С.104–108.

2. *Музыкальная* социология: Программа для музыкальных вузов по специальности «музыковедение» / Сост. И.М.Головач. – Мн.: Бел.гос.акад.музыки, 1998.

3. *Сацыялогія* // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2002. – Т.14. – С.214–215.

4. *Социология:* Учеб. программа для высших учебных заведений / Сост.: Е.М.Бабосов, А.Н.Елсуков, П.Г.Игнатович и др. – Мн., 2000.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ